A R T Y K U Ł Y

ROCZNIKI HUMANISTYCZNE
Tom LIV-LV, zeszyt 7 – 2006-2007

ЕЖЫ ВАШКЕВІЧ

# „HOMO SOVIETICUS” – ФЕНОМЕН І АРХЕТЫП

Посткамунізм прынёс новыя з’явы і рэаліі жыцця, з якімі мы раней не сутыкаліся. Так сталася таму, што новае нібыта наклалася на старое, утварыўшы спецыфічную сацыяльна-палітычную і эканамічную сумесь. Яе вывучэнне і прызвычайванне да новых умоў – справа будучыні. Сёння яшчэ цяжка казаць як будзе развівацца сітуацыя, хаця калі-некалі і можна скарыстаць аналогію ці прагноз. Аднак прадбачанне не ёсць метадам гісторыі, і яна, як вядома, не церпіць умоўнага ладу. Затое мы ведаем тое, што было. Прынамсі павінны гэта ведаць, бо яно якраз і ёсць той другі чыннік сёняшняй грамадскай трансфармацыйнай сумясі. Але вывучэнне найноўшай гісторыі і з’яў з ёй звязаных заўсёды тоіць у сабе небяспеку памылкі, большую, чым пры даследаванні больш адлеглых часоў. Гэта падаецца парадоксам, бо ж і дакументаў захавалася болей, і сведчанняў непасрэдных удзельнікаў падзей, і часавая дыстанцыя карацейшая. Але менавіта ў гэтай кароткай дыстанцыі і справа. Найноўшая гісторыя распавядае пра факты, ахопленыя памяццю ўдзельнікаў і сведак падзей. Часам справа даходзіць да сутыкнення ведаў аб фактах, пачэрпнутых з пісьмовых крыніц, з памяццю асоб, якія гэтыя факты перажылі і памяталі. Нярэдка сістэма каштоўнасцей даследчыка іншая чым погляды тых людзей, або нават ідэалогіі цэлых фармацый, якія ён апісвае. Усё гэта бывае крыніцай шматлікіх супярэчнасцей і палемік. Гісторыя тут становіцца як бы фактам біяграфіі. І асноўная цяжкасць – гэта эмацыянальнае стаўленне да добра вядомых, асабіста перажытых часоў і здарэнняў, кароткасць часавай дыстанцыі іншымі словамі. Да гэтага дадаецца

DR JERZY WASZKIEWICZ – Ośrodek Naukowo-Oświatowy im. F. Skaryny w Mińsku, e-mail: waszkiewicz@skc.edu.by

перанасычанасць фактамі, памяць пра якія яшчэ жывая, і якія хочацца прадставіць як мага поўна. Пры гэтым лёгка траціцца асноўная тэндэнцыя, найбольш істотныя, паваротныя пункты ў развіцці падзей, якая губляецца ў завалах другарадных эпізодаў. Але ёсць і трывалыя рысы, якія, нават пры розным да іх стаўленні, захоўваюць свае невынішчальныя адметныя характарыстыкі. Яны могуць дыяметральна супрацьлегла ацэньвацца, але ніхто не адмаўляе факту іх існавання. Менавіта да такіх і належыць феномен *homo sovieticus* – чалавека савецкага, які ў масавым маштабе ўзнік і развіўся ў часы СССР і працягвае сваё існаванне ў нашы дні, страчваючы, праўда, з кожным годам сваю цесную першародную сувязь з „матчыным" улоннем. А гэта значыць, што ён жывы. Таму вывучэнне гэтага архетыпу мае не толькі пазнавальны і тэарэтычны сэнс, але і цалкам практычны. Цяжка сказаць якая доля тут належыць псіхолагам, сацыёлагам, філосафам і гісторыкам. Паспрабуем закрануць гэтую праблему з гістарычнага пункту гледжання.

Трэба адзначыць, што калі гаворка ідзе пра савецкае грамадства, паралелі з іншымі грамадствамі, як у гістарычным, так і сацыяльна-палітычным сэнсе, былі б шмат у чым няслушныя. Савецкае грамадства было новым гістарычным тыпам, і таму для правільнага і адэкватнага яго апісання трэба асаблівую ўвагу звярнуць на тэрміналогію і яе сэнс.

Сістэма, створаная Леніным, і не зусім дакладна называная савецкай, заснаваная на камуністычнай ідэалогіі, тэорыі класавай барацьбы і дыктатуры пралетарыята, мела некалькі характэрных рысаў. Суб'ектам у гэтай сістэме была партыя, а не рабочы клас, як паўсюдна дэкларавалася. Праўда, апошні, дзеля афіцыйна ўскладзеных на яго функцый „гегемона", г. зн. шыльды, што ўтойвала змест дыктатуры, мог разлічваць на абмежаваныя прывілеі. Татальная ўлада камуністычнай партыі дазваляла ёй не толькі ліквідаваць іншадумства, але нават і ўспамін аб ім. Пры гэтым, старанны адбор узносіў на вяршыні партыйнай іерархіі ўзорных савецка-партыйных бюракратаў, якія маглі служыць прыкладам ідэальнага савецкага чалавека для мільёнаў сваіх грамадзян. Для Леніна апраўданнем рэвалюцыі была ўлада, якая б дазволіла пабудаваць утопію. Ён таксама верыў, што ў яго руках знаходзіцца ключ ад таямніцы сацыяльнага развіцця і магічны рэцэпт цуду. Патрабавалася стварыць чалавека жыхара Ўтопіі, чалавека, які б лічыўся ячэйкай дзяржаўнага механізму. Паколькі стварэнне абяцанага раю на зямлі і задавальненне матэрыяльных патрэб насельніцтва было для камуністаў недасяжнай задачай, яны спрабавалі тлумачыць адсутнасць сваіх поспехаў у гэтым напрамку нейкімі звышнатуральнымі містычнымі прычынамі. Вера ў цуд была неад'емным элементам „адзіна слушнай" ідэалогіі, якая ўяўляла сабой набор аксіём, што не патрабавалі доказу. Грамадзян жа прымушалі

трымацца рытуалу, карыстацца рытуальнай мовай, прывучаючы да новай сітуацыі абсалютнай залежнасці ад улады і адсутнасці якогакольвечы нонканфармізму.

Для асэнсавання бальшавізму вельмі важным з’яўляецца зразуменне бальшавіцкай стратэгіі хлусні, бо хлуслівае слова ў створанай імі сістэме было вельмі важным сродкам. Слова, якое „было спачатку”, падмянілі, змянілі яго сэнс. Можна сказаць, што нават не тэрор быў галоўным інструментам уздзеяння, хутчэй дапаможным, улічваючы абшар ахопу „аб’ектаў”. Замена праўды на падман, стварэнне сістэмы маны, было адным са спосабаў стварэння чырвонай імперыі – СССР. Народныя масы, атуманеныя хлуслівым словам, прызналі гэтае слова за ўласнае. З тае пары яны трымаюцца сваіх стэрэатыпаў, бо апрача гэтага ў іхняй памяці не засталося амаль нічога.

Вельмі істотным чыннікам быў аўтарытэт „правадыра”, які быў адначасова аўтарытэтам партыі і выпраменьваў магічную сілу ўздзеяння на суцэльна падпарадкаваныя ім масы. Містыцызм „правадырства” заключаўся ў з’яве „заклінання”. Паводле адчуванняў савецкага грамадства, дастаткова было каб галава дзяржавы ці партыя назвалі зло па імёнах, прынялі адпаведную пастанову – і зло знікала. Гэтая магічная вера ў моц словаў правадыра глыбока ўвайшла ў свядомасць савецкага чалавека. Ён верыць ім не шукаючы лагічнага абгрунтавання, доказаў і аргументаў, верыць, таму што словы сказаны „на самым вышэйшым узроўні”.

*Homo sovieticus* паслярэвалюцыйнай эпохі ўзяўся за ўмацаванне новага сацыяльна-палітычнага парадку. Насамрэч гэта была барацьба са светам універсальных каштоўнасцей, які меў метафізічнае вымярэнне, у імя адносных каштоўнасцей, падпарадкаваных ідэі сацыялізма-камунізма. Яго характэрнай рысай быў канфармізм і безумоўнае змірэнне з існаваннем пануючай сістэмы. Савецкі чалавек не ёсць унутрана аднароднай істотай, якая выяўляе ўсе свае рысы ў заўсёды аднолькавай ступені. Іх узмацненне змяняецца ў залежнасці ад фазы развіцця альбо дэструкцыі сістэмы. Аднак у ніякім выпадку ён не з’яўляецца міфічнай істотай, ані таксама абстрактнай ідэяй.

Таталітарная сістэма спрыяе фарміраванню асобы, якая ў асноўным разважае катэгорыямі адарванымі ад рэчаіснасці, але шчыльна звязанымі з ідэалогіяй. *Homo sovieticus* гэта духоўная фармацыя канкрэтных людзей, якая нараджаецца на базе канкрэтнай ідэалогіі, таму што выключна ідэалогія мае вырашальнае значэнне для яго фармавання. Дзякуючы ідэалогіі ён мае некалькі сталых адметнасцей. Адной з асноўных з’яўляецца адсутнасць індывідуалізацыі асобы, што вынікае з факту яе калектывісцкага характару. Аднак перадусім савецкі чалавек мае заідэалагізаваную свядомасць, якая ўсё рэлятывізуе. У гэтай свядомасці няма

месца безумоўным і абсалютным каштоўнасцям, маючым метафізічна-рэлігійнае вымярэнне, таксама, як няма ў ёй месца для такой свабоды, якая б гэтым каштоўнасцям служыла. *Homo sovieticus* духоўна зняволены да такой ступені, што ён не адчувае самой патрэбы свабоды, таксама як патрэбы ў па-над часовых і па-над асабістых каштоўнасцях. Характэрнай праявай гэтага зняволення з'яўляецца поўная адсутнасць адказнасці. Савецкі чалавек не пачуваецца адказным ні за што і ні за каго. Калі ён належыць да апарата ўлады, усё, што ён робіць, ён тлумачыць сваёй місіяй адносна чалавецтва, лічыць, што спасцігнуў дух гісторыі, які заклікае яго да стварэння светлае будучыні. Калі ж ён з'яўляецца шэрым абывацелем, дык становіцца паслухмяным выканаўцам рашэнняў, якія прымае за яго ўлада.

Даўгатэрміновае падтрымліванне камуністычнай сістэмы было магчымым толькі пры ўмове стварэння „новага чалавека", „чалавека новага тыпу". У дактрынальным сэнсе ён сфармаваўся ва ўмовах бальшавізму, г. зн. ленінізму і яго лагічнага працягу – сталінізму, што грунтаваліся на расейскай нацыянальнай традыцыі і адаптаванай адпаведным чынам марксісцкай дактрыне. Узор савецкага чалавека стварыла, зрэшты, сама афіцыйная камуністычная ідэалогія. Таму савецкая гісторыя, калі глядзець на яе з гэтага пункту гледжання, у канчатковым выніку зводзіцца да гісторыі фармавання савецкага чалавека, ці стварэння ўмоў, у якіх чалавек перастае паступаць так, як паступаў раней, пачынае ўпітываць і акумуляваць народжаныя новым ладам пачуцці, думаць, меркаваць і адчуваць па-новаму. Кожнае наступнае пакаленне ставілася да створаных у ходзе савецкай гісторыі ўмоў як да нормы, а пазнейшыя пакаленні ўжо лічылі іх адзіна нармальнымі.

Лічыцца, што паняцце „гома савецікуса" ўпершыню ўвёў Аляксандр Зіноўеў. Але ў г. зв. саветалогіі паняцце *homo sovieticus* існавала задоўга да Зіноўева. Гэты тэрмін з'явіўся яшчэ да вайны, у Германіі. Зіноўеў жа прысвяціў гэтай з'яве асобную кнігу *Homo sovieticus*, выдадзеную ў Лондане ў 1970 г. У ёй ён разглядае асаблівасці і глыбінныя матывацыі паводзінаў савецкага чалавека, ці, калі казаць больш дакладна, чалавека савецкага тыпу. Гэта не значыць, што да Зіноўева ніхто не звярнуў увагу на гэты феномен. Ён быў заўважаны значна раней, амаль што ў момант яго зараджэння, у першыя гады існавання савецкай улады. Першымі яго пачалі апісваць тыя, хто заўсёды найбольш абвострана адчувае радыкальныя перамены ў грамадстве – пісьменнікі, людзі мастацтва, філосафы, інтэлігенцыя ўвогуле. Апісанні такога тыпу чалавека мы можам сустрэць у Міхаіла Булгакава, Яўгенія Замяціна, Альдоўза Хакслі, Міхаіла Зошчанкі, Андрэя Мрыя, Юзафа Мацкевіча, Івана Буніна, Францішка Аляхновіча, Мікалая Бярдзяева і інш., якія яшчэ ў 20-я гады

сутыкнуліся з новымі палітычнымі і культурнымі рэаліямі і іх прадуктам – новым тыпам чалавека. Гэта чалавек, які быў спароджаны ўмовамі існавання камуністычнага грамадства, і які з’яўляецца носьбітам яго жыццёвых прынцыпаў. Можна нават казаць пра спецыфічную савецкую псіхалогію такога тыпу людзей, якія ідэнтыфікуюць сябе з усёй гісторыяй Савецкага Саюза. Аднак, як заўважаў той жа А. Зіноўеў, не кожны грамадзянін СССР ёсць „гома саветікус” і не кожны „гома савецікус” ёсць грамадзянін СССР. Гэты псіхалагічны тып не трэба таксама цалкам атаясамліваць, напрыклад, выключна з сябрамі камуністычнай партыі. Як комплекс акрэсленых якасцей, ён можа выявіцца ў любым канцы свету, але ў найбольш чыстым выглядзе, шырокім маштабе і масава „гома савецікус” праяўляе сябе толькі там, дзе гістарычна цалкам сябе рэалізаваў – на тэрыторыі былога СССР і сацлагера. Як адзначана, далёка не ўсе жыхары „камуністычнага раю” былі савецкімі людзьмі ў вышэйзгаданым сэнсе. Сярод іх вылучаліся групы дысідэнтаў, якія абсалютна не прымалі камуністычную мадэль пабудовы грамадства і адкрыта гэта дэкларавалі. Такіх жорстка падаўлялі, ізалюючы ў канцлагерах, дзе яны часта гінулі, або высылалі па-за межы краіны. Адкрыта дысідэнцкія погляды выказвалі перадусім альбо вучоныя, альбо пісьменнікі. Сама прафесія схіляла іх да адстойвання самастойнага пункту гледжання і развіцця незалежнага мыслення. Але адначасова яны сутыкаліся з палітычнымі і ідэалагічнымі абмежаваннямі і ўціскам, якія перашкаджалі ім цалкам рэалізаваць свой патэнцыял. Яшчэ большую групу складалі тыя, хто падзяляў іх погляды, але не адважваўся іх выказваць, прынамсі сярод асоб, да якіх не было даверу. Шмат хто з прадстаўнікоў інтэлігенцыі імкнуўся ў межах існуючай сістэмы рабіць тое максімальна магчымае, што дазвалялі вузкія рамкі таталітарызму. Часам сістэма, парадаксальным чынам, спараджала зусім унікальныя выпадкі арганічнага антыкамунізму. Прыкладам такога тыпу пазіцыі можа служыць рускі пісьменнік Віктар Ярафееў, сын высокага савецкага чыноўніка-дыпламата, перакананага камуніста і „сталінскага сокала”, як яго акрэсліў сам Ярафееў. Правёўшы дзяцінства ў Парыжы ён адрынуў савецкую рэчаіснасць і ніколі не стаў савецкім чалавекам. „Я да такой ступені ненавідзіў камунізм, што гатовы быў падтрымліваць амерыканскую інтэрвенцыю ў В’етнаме, з разуменнем прыняў я нават вайсковы пераварот Піначаэта...”, казаў пісьменнік[1]. Савецкі дысідэнт Уладзімір Букоўскі беспаспяхова пераконваў заходні эстэблішмэнт падчас гарбачоўскай перабудовы, што камунізм не з’яўляецца палітычным ладам, нават злачынствам, а нейкай своеасаблівай заразнай хваробай, як эпідэ-

[1] W. J e r o f i e j e w , *Syn ambasadora,* „Gazeta Wyborcza”, z dn. 28-29.12. 2002, s. 16.

мія чумы. На чуму нельга пакрыўдзіцца, з ёй нельга пасварыцца або замірыцца, ёю можна захварэць альбо не. Таму чуму нельга перабудаваць ці рэфармаваць, сцвярджаў ён, трэба ад яе вылечыцца. А той, хто перастаў з ёй змагацца, каго агарнула апатыя, як правіла, не мае шанцаў выжыць[2].

Мікалай Бярдзяеў у сваёй кнізе *Новае сярэднявечча. Роздумы пра лёсы Расіі і Еўропы*, напісанай у хуткім часе пасля яго выгнання з Савецкай Расеі, піша аб узнікненні новага „антрапалагічнага тыпу”, новага чалавека – не нацыянальнага, а інтэрнацыянальнага кшталту[3]. „Адбылася метамарфоза некаторых твараў, раней невядомых. З’явіліся зусім новыя твары, якія раней не сустракаліся ў рускім народзе. З’явіўся новы антрапалагічны тып, у якім ужо не было дабрыні [...] Аніякага падабенства да твараў старой рускай інтэлігенцыі, якая падрыхтоўвала рэвалюцыю. Новы антрапалагічны тып выйшаў з вайны, якая і дала бальшавіцкія кадры. Гэта тып настолькі ж мілітарызаваны, што і тып фашысцкі.”, успамінаў пазней аўтар[4]. У рамане Яўгенія Замяціна *Мы* жыхары краіны Ўтопіі настолькі страцілі сваю індывідуальнасць, што адрозніваюцца паміж сабой па нумарах, а кіруючы прынцып дзяржавы заключаецца ў тым, што шчасце і свабода несумяшчальныя.

У даследаваннях савецкіх сацыёлагаў 20-х гадоў XX стагоддзя канстатавалася хуткае ўзрастанне сярод насельніцтва пачуцця чэрствасці, жорсткасці, цынічнага эгаізму. Асабліва выразна праяўлялася гэта тэндэнцыя сярод моладзі, што сведчыла аб навізне самой з’явы, а менавіта, характэрным уздзеянні новага ладу на чалавека. Таму няма нічога дзіўнага ў тым, што далейшыя сацыялагічныя даследаванні ў СССР былі забаронены, а вынікі папярэдніх былі канфіскаваныя з савецкіх бібліятэк. Сацыялогія, як навука, была скасавана і адрадзілася толькі на пачатку 60-х гадоў. Гэта і зразумела. Сацыялогія даследуе рэаліі, а ў часы, калі абавязковым было ідэалагічнае бачанне свету, запатрабаванасць ведання таго, што рэальна існуе, было папросту непрымальным, бо рэчаіснасць аказвалася спрэчнай з ідэалогіяй. Даследаванне рэчаіснасці ішло ў пары з вялікай рызыкай, таму што ўсе гэтыя супярэчнасці маглі быць выяўлены. Дарэчы, на сёняшняй Беларусі можна заўважыць, што замест супрацоўніцтва на базе элементарнага даверу і талерантнасці мае месца нястрымны канфлікт індывідуальных і групавых эгаізмаў. Постсавецкі

---

[2] Zob. V. Bukovsky, *Judgement in Moskow*, Paris: Robert Laffont, S.A, 1995.

[3] Н. Бердяев, *Новое средневековье. Размышления о судьбах России и Европы*, Берлин 1924, s. 94.

[4] Тенже, *Самопознание (Опыт философской автобиографии)*, Москва 1991, s. 230.

грамадзянін патрапіць дамагацца задавальнення толькі сваіх уласных інтарэсаў, пачуццё супольнай карысці яму незнаёмае.

Асноўнай рысай чалавека таталітарнай эпохі з'яўляецца яго ізаляванасць, адарванасць ад сваіх каранёў. Такая ізаляваная асоба не бачыць сэнсу ў захаванні старых традыцыйных каштоўнасцей, таму што яны здаюцца непрыдатнымі ў новым змененым свеце, дзе волю і ідэалогію дыктуе толькі адна партыя. Захаванне традыцый і існаванне ўласных поглядаў, адрозных ад афіцыйных, становіцца нават небяспечным, бо партыя, ці карпарацыя, якая ажыццяўляе ўладу, патрабуе ад грамадства поўнай, неабмежаванай, безумоўнай і нязменнай лаяльнасці і падпарадкаванасці. Каб утрымаць гэтае становішча, яна дамагаецца ад грамадзян перапынення ўсялякіх сувязей, якія не вынікаюць з актуальных мэтаў партыі. Калі ж гэтыя мэты не маюць нічога агульнага з папярэднімі сацыяльным і грамадскім ладам, а метады іх рэалізацыі дасягаюцца пры дапамозе тэрору – перарыванне нацыянальнай і культурнай традыцыі наступае вельмі хутка.

Мікалай Бярдзяеў сцвярджаў, што ў камунізме на матэрыялістычнай аснове непазбежна падаўленне асобы, а рэвалюцыйная камуністычная мараль непазбежна аказваецца бязлітаснай у адносінах да канкрэтнага чалавека. Індывідуальны чалавек разглядаецца як сродак, цаглінка, патрэбная для будаўніцтва камуністычнага грамадства[5]. Адной з крыніц дэспатызму камуністаў з'яўляецца ўсведамленне імі супрацькамуністычных схільнасцей чалавечай натуры. Пастаянную пагрозу для камунізма ўяўляе вечнае імкненне чалавечай асобы да захавання сваіх натуральных інтарэсаў і зацікаўленасцей. Ідэалам жа таталітарнага ладу ёсць чалавек-аўтамат, пазбаўлены свабоды і волі, невялічкае кола ў агромістай сацыяльнай машыне. Таму зліццё з „калектывам” становіцца адной з найважнейшых мэтаў і патрэб не толькі сяброў камуністычнай партыі, але і ўсіх членаў таталітарнага грамадства. Дасягнутае такім чынам адзінства дае неабходнае кожнаму чалавеку пачуццё прызнання іншымі вартасці свайго існавання. У гэтым выпадку яно замяняе страчанае (ці малапрэстыжнае ў новых умовах) пачуццё асабістай значнасці і каштоўнасці як індывідуума. Наступствы такога атаясамлівання вельмі сур'ёзныя. Чалавек жорстка і абсалютна падпарадкоўваецца ўладзе, пазбаўляецца інстынкту супраціву і свабоды. Ён абсалютна пластычны, няздольны да якога-небудзь самастойнага асабістага выбару і прызвычаены да таго, што кожная каштоўнасць рэлятывізавана адносна інтарэсаў улады. Ва ўмовах пашырэння абсягу таталітарнай сістэмы і паглыблення яе інтэнсіўнасці, такая залежнасць апаноўвае чарговыя слаі грамадства і ста-

[5] Т е н ж е, *Истоки и смысл русского коммунизма*, Париж 1955, s. 125.

новіцца ўсё больш усеахопнай, трывалай, звычнай. Канфармізм, нерацыянальнасць дзеянняў набываюць ў такім грамадстве-"калектыве" ўсё больш паўсюдны характар. Яны становяцца асабліва заўважальнымі пры сутыкненні з нармальнымі ўмовамі існавання, таму таталітарная ўлада заўсёды імкнецца максімальна ізаляваць такі „калектыў" ад вонкавага свету каб выключыць магчымасць супастаўлення і параўнання. У гэтым сэнсе паказальнымі з'яўляюцца ўражанні полькі, вязня калымскіх канцлагераў якая паходзіла з Заходняй Беларусі і не спазнала „калектывісцкага" савецкага выхавання. Да сутыкнення з савецкімі людзьмі яна не ўсведамляла, што адрозненні паміж імі і яе светам заходзяць так далёка. Нават прадстаўнікі рускай інтэлігенцыі здаваліся ёй чужымі. Нягледзячы на ўсебаковую адукаванасць гэтай смятанкі савецкага грамадства, ад заходняга свету іх аддзяляла прорва. Доўга знаходзячыся ў канцлагеры яны маглі пераканацца, чым ёсць праўда рэальнага сацыялізму, аднак надалей былі вернымі партыі, ідэалагічным лозунгам. Яны ставіліся да калектыву, яго інтарэсаў і волі як да нечага святога. Асоба, яе правы на ўласныя перакананні, прыватнае жыццё, не мелі такога значэння. „Калі я казала пра пакуты асобы, яны мяне не разумелі, бо якое гэта можа мець значэнне пры пабудове такога вялікага ладу... А гэта ж былі людзі, якія складалі эліту"[6].

Такім чынам, *homo sovieticus* з'явіўся ў выніку прыстасавання да акрэсленых сацыяльных умоў. Сітуацыя, у якой кожная індывідуальная дзейнасць залежала ад улады, прымушала да спецыфічных паводзінаў. Матывам такіх паводзінаў з'ўлялася пастаяннае жаданне выконваць волю ўлады, якая б яна не была, таму што ўлада пачынала атаясамлівацца з дабром (у выніку адпаведнага выхавання, індактрынацыі і прапаганды, спалучаных з прымусам і тэрорам), а ўсе, хто ёй супрацівіўся – увасаблялі ў вачах „калектыву" зло. Але „новы калектыўны" чалавек мог існаваць толькі ў межах таталітарнай сістэмы. Пасля яе распаду, першапачатковы намер яго стварэння выклікаў нешта накшталт контррэвалюцыі, якая спарадзіла крайняе самалюбства, падазронасць, грамадскую амнезію і асацыяльныя паводзіны, якія патрабуюць пастаяннага кантролю і прымусовых захадаў.

Таталітарныя ўмовы існавання асобы ствараюць людзей без маралі, а дакладней са своеасаблівым яе разуменнем, якія страцілі магчымасць карыстацца традыцыйнымі маральнымі крытэрыямі. У выніку ўзнік спецыфічны тып асобы, несумленнасць, бессаромнасць, паклёпніцтва, цынічная помстлівасць і хваравітая падазронасць, няшчырасць і хлуслівасць

---

[6] *Przestroga przed utopią. Z profesor Barbarą Skargą rozmawia Izabella Sariusz-Skąpska*, „Znak", 1993, nr 7, s. 115.

якой не ўспрымаліся як нешта непрымальнае ці нават адмоўнае. „У грамадстве гомасосаў"[7] – піша А. Зіноўеў – „ёсць свае крытэрыі ацэнкі якасцей і паступкаў паасобных яго членаў. Гэтыя крытэрыі шмат у чым не супадаюць з аналагічнымі крытэрыямі ў грамадствах іншага тыпу. Яны сітуацыйныя. З гэтага пункту гледжання гомасос гнуткі і пластычны да такой ступені, што ён здаецца зусім бесхрыбетным. Ён мае параўнальна вялікую амплітуду хістанняў сацыяльна-псіхалагічных станаў і ацэнак. [...] Калі глядзець на паводзіны гомасоса з гледзішча нейкай абстрактнай маралі, ён падаецца істотай зусім немаральнай. Але няслушна было б лічыць, што ён немаральны. Ён ёсць істотай ідэалагічнай у першую чаргу. І на гэтай падставе ён можа быць маральным або немаральным, гледзячы па абставінах"[8]. Па-сутнасці, гаворка ідзе пра адноснасць маральных прынцыпаў, якая заключаецца ў прызнанні за кожным чалавекам права на іх пагляд. Сама ўлада выхоўвала такім чынам сваіх грамадзян, бо яна заўсёды прыстасоўвала тэарэтычную базу да сваіх канкрэтных рашэнняў. Гэты рэлятывізм быў з часам засвоены ўсім насельніцтвам, змяняючы знішчаныя разам з рэлігіяй хрысціянскія прынцыпы. У выніку ўзніклі трывалыя асаблівасці, характэрныя для жыцця ў такім грамадстве. Гэта тып людзей арыентаваных на пасіўнасць, руціннасць, цяжкую і бяздумную працу. Паступова ў іх фармуюцца рысы, якія лапідарна можна акрэсліць як жабрацкія, ці нават зладзейскія. У іх паводзінах таксама выразна дамінуюць самаахоўна-абарончы і дамагальна-прэтэнцыёзны матывы. Да таго ж, яны, найчасцей, нядольныя да якой-небудзь наватарскай дзейнасці, якая патрабуе адказнага самастойнага мыслення. Вельмі часта такая нядольнасць выклікана не толькі псіхічнымі чыннікамі, якія ўздзейнічаюць на асобу ў закрытым грамадстве, але і інтэлектуальнай нядужасцю ва ўмовах ізаляцыі і адарванасці ад асноўных плыняў сусветнага культурнага і навуковага развіцця. Наступствам такога стану з'яўляецца таксама сітуацыя, калі чалавек пазбаўляецца магчымасці скарыстоўваць большасць элементарных паняццяў, неабходных для разумення маральных праблем і атачаючай яго культурнай і сацыяльнай рэчаіснасці. У той жа час у яго фармуюцца такія рысы як: жаданне падпарадкоўвацца ўладзе, якая ўспрымаецца некрытычна, у якасці ідэалізаванага аўтарытэта; устойлівая схільнасць да выключэння са сваёй групы людзей, якія парушаюць агульнапрынятыя ў таталітарным грамадстве нормы; гіпербалізаванае мысленне стэрэатыпамі; выразная тэндэнцыя і нават імкненне да ўжывання сілы пры вырашэнні

[7] *Гомасос*, паводле А. Зіноўева, гэта скарочаная назва *гома савецікуса* ці савецкага чалавека.

[8] А. З и н о в ь е в, *Гомо советикус*, Москва 1991, s. 311-312.

разнагалоссяў і спрэчных пытанняў, дэструктыўнасць і цынізм у дзеяннях.

Цікавымі назіраннямі адносна савецкіх людзей дзеліцца ў сваіх успамінах Ларыса Геніюш, якая ўпершыню сутыкнулася з тыпам „новага чалавека" у Празе, падчас другой сусветнай вайны. Адзначаючы адсутнасць у савецкіх традыцыйна зразуметых любові і ахвярнасці для Радзімы, жыццёвых вартасцей і веры, яна піша: „Мы вельмі расчароўваліся ў г.зв. савецкіх людзях-беларусах, яны йшлі ўсімі абманамі да сваіх шкурных мэтаў, не ведаючы ніякае этыкі. Былі спрытнымі і хітрымі, іх мэтады былі часам страшныя. Гэта былі ваўкі. Ніякае дабрыні ці міласэрнасці і ніякіх граніцаў для зла. Гутарка з імі не акрыляла, а настарожвала тым, што прыніжалі яны лепшае ў людзях і людзкасці. Здавалася, што цяжкія варункі жыцця даўно ўжо забілі ў іх розныя ідэалы акрамя тых, якія ў даны момант аплочваліся"[9]. Аднак не ўсе крытыкі „гома савецікуса" выказваліся пра яго заўсёды катэгарычна крытычна. Рабіліся не толькі спробы зразумець, але і спачувальна патлумачыць гэты феномен. Палітвязень Анатоль Марчанка заўсёды адчуваў сябе чужым у родным горадзе. Яго раздражнялі самі кантакты з савецкімі людзьмі. Але: „З гадамі я зразумеў"– пісаў ён – што быў несправядлівы да сваіх землякоў. Яны жылі звычайным жыццём, тымі інтарэсамі, якія гэтае жыццё ім дыктуе. [...] Ці я магу пагарджаць сваімі суайчыннікамі за тое, што яны ня ведаюць, чаго хочуць? У рэшце рэшт маё ўласнае непрыманне савецкіх умоў жыцця не больш канструктыўнае, чым агульная бязмэтная незадаволенасць. Гвалтам замураваныя, адгароджаныя ад свету ідэйна і фізічна, пазбаўленыя інфармацыі не толькі аб свеце, але і пра саміх сябе, – мы здольныя толькі да разбуральнай крытыкі і да выпрацоўкі ідэй, якія не суадносяцца з рэальнасцю"[10].

Савецкая сістэма імкнулася да пабудовы падвойнай свядомасці. Каб зразумець паходжанне гэтай з'явы, звернем увагу на наступную схему. Падман, у звычайным значэнні гэтага слова, азначае свядомы адыход ад вядомай рэчаіснасці. Гэта значыць, што падманшчык ведае праўду, і калі ён ад яе адыходзіць каб схлусіць, ведае, што дае змененую версію праўды. У ідэалогіі адбываецца іншы працэс. Ужо не супрацьстаўляюцца рэчаіснасць і нерэчаіснасць, праўда і няпраўда, але наступае дзіўны падзел або распад рэчаіснасці. Мы маем справу з дзвюма living рознымі рэчаіснасцямі: рэчаіснасцю і псеўдарэчаіснасцю; рэчаіснасцю, якую можна ўбачыць, пачуць і да яе дакрануцца, і іншую, якая існуе выключна ў выказваннях, у мове, у прапагандзе. Паўтараючы штораз афіцыйную хлус-

[9] Л. Геніюш, *Споведзь*, „Маладосць", 1990, № 3, s. 122.

[10] А. Марченко, *Живи как все*, Москва 1993, s. 343.

ню і ведаючы, што гэта мана, усе грамадзяне станавіліся саўдзельнікамі партыі і дзяржавы ў змане. Таму трэба было верыць няверачы і менавіта такі стан свядомасці партыя імкнулася ўтрымліваць у сваіх сябрах, а па магчымасці і ва ўсім грамадстве, каб такім чынам усіх зрабіць адказнымі за існуючы лад. Паколькі было вядома, што праўда заўсёды „партыйная", падман сапраўды станавіўся праўдай, нават калі гэта пярэчыла самаму відавочнаму досведу. Тое жыццё ў падвойнай рэчаіснасці было адным з найбольш характэрных „дасягненняў" савецкай сістэмы. Адсутнасць адкрытай крытыкі і магчымасці выказваць свае сапраўдныя думкі прыводзілі да таго, што незалежная думка не магла з'явіцца нават падчас звычайнай размовы. Узнікала пастаянна хаваная супярэчнасць паміж рэалізаванай калектыўнай воляй таталітарнай улады і асабістымі думкамі і пачуццямі людзей. Дысананс паміж рэчаіснасцю і ідэалагічнай утопіяй, паміж нармальным словам і яго змененым новамовай значэннем быў такі вялікі, што можна было казаць пра існаванне двух светаў у свядомасці кожнага чалавека, двух рэчаіснасцяў, якія прыводзілі да ўсеагульнай, сацыяльнай шызафрэніі. У масавым маштабе праявілася з'ява, калі людзі гавораць адно, думаюць нешта іншае, а дзейнічаюць яшчэ інакш. Такім чынам, адбылося раздваенне свядомасці і паступкаў – адзін тып паводзінаў пры афіцыйных кантактах і зусім іншы пры асабістых. Жыццё савецкіх людзей пераўтварылася ў своеасаблівую гульню, у якой уласная асоба паступова гублялася. Функцыянаванне ў дзвюх рэальнасцях – сапраўднай і ўтапічнай – непазбежна павінна было прывесці да дваякага стаўлення адносна ўсіх спраў і пастаяннага выбару – які тып індывідуальнасці трэба скарыстаць, каб дасягнуць сваю мэту. Такім чынам, ва ўмовах дэзінтэграванай і ўнутрана спрэчнай сістэмы норм, людзі павінны былі прыстасоўвацца да спрэчных патрабаванняў, а такая сітуацыя прыводзіла да разлажэння сістэмы сацыяльных нормаў і да распаду грамадскіх сувязяў, выклікала дэзінтэграцыю асобы, што праяўлялася ў яе непавазе да правоў і норм суіснавання супольнасці.

У выніку большая частка народа павінна была весці двайстае інтэлектуальнае і духоўнае жыццё. Падчас аднаго, якое адбывалася на відавоку, чалавек мог паўтараць самую гратэскную хлусню і маўчаць пра самую шчырую праўду. У сваім другім жыцці, абмежаваным колам надзейных сяброў і знаёмых, гэтая праўда прамаўлялася. Шмат хто ўвогуле нікому цалкам не давяраў, паколькі ўсюдуісныя органы бяспекі паўсюль мелі паведамляльнікаў- „стукачоў". Дзяржаўная манаполія на інфармацыю і жорсткая ідэалагічная цэнзура, падмацаваныя практыкай палітычных даносаў, паступова прыводзіла да ўпадку інтэлектуальнага і духоўнага жыцця. Тое, што ў іншых грамадствах давала людзям магчымасць выпрацоўваць сваё меркаванне з нагоды акрэсленых палі-

тычных, грамадскіх, культурных і іншых пытанняў – адкрытасць і свабода дыскусіі, - стала зусім немагчымым у СССР. У гэтых умовах большасць людзей папросту не ведала, што яны маюць думаць, і ўпадала ў цынізм і канфармізм. Людзі ўголас паўтаралі ідэалагічныя догмы-заклінанні, але ніколі не верылі ім усур'ёз.

Даўгатэрміновае фармаванне чалавека ў такіх умовах надало яму асаблівыя рысы, якія з упэўненасцю можна акрэсліць як характэрныя прыкметы чалавека савецкага тыпу. Гэта перш за ўсё прымітыўны эгалітарызм, зразуметы як праява сацыяльнай справядлівасці. У пары з ім ідзе адсутнасць павагі да прыватнай уласнасці, бо ўласнасць гэтая была забаронена, як, дарэчы, і самастойная, непадкантрольная дзяржаве праца. Гэта ў сваю чаргу спараджала адсутнасць пачуцця адказнасці за самаго сябе, прывычку чакаць „дабрадзействаў" ад дзяржавы, боязь праяўляць ініцыятыву. У выніку пашыралася недабрасумленнасць у стаўленні да абавязкаў, якія ўспрымаліся з абыякавасцю, як не свае асабістыя, а абстрактна дзяржаўныя, агульныя, нічые. Да гэтага дадалася страта традыцыі, грамадзянскіх каштоўнасцей і неразуменне дэмакратычных прынцыпаў жыцця, дзяржаўнага ўладкавання, можна нават сказаць адсутнасць унутранай патрэбы ў іх. Тое, што можна назваць атрафіяй усялякага грамадзянскага пачуцця і грамадзянскай годнасці. Гэтае апошняе не здзіўляе, калі ўлічыць, што некалькі пакаленняў савецкіх людзей нарадзіліся і выхаваліся ва ўмовах тэрору таталітарнай дзяржавы. Таму ў іх выгадаваўся панічны страх перад начальствам і рабская пакорлівасць самым дзікім актам сваволі рэжыму. Невыпадкова да адной з характэрных рысаў „гома савецікуса" належыць ухваленне і прыняццё ўсяго, што пастанаўляюць „на версе", прычым ухваленне зусім шчырае. Шматгадовы вязень савецкіх канцлагераў літаратар і навуковец Алег Волкаў адзначаў, што больш за ўсё кідалася ў вочы ўсеагульная абачлівасць і звычка не мець свайго ўласнага меркавання. Ухвалялася і рабілася нормай ўсё, што зыходзіла ад улады"[11]. Пры гэтым савецкі чалавек характарызуецца абсалютнай апатыяй да духоўных пошукаў, плебейскай рысай – адсутнасцю духоўнай узнёсласці. Адначасова для яго характэрна адмысловая палітычная двудушнасць і мэтанакіраваная мана, як сродак самастрахавання. Зусім фенаменальнай можна назваць з'яву абагаўлення ўласных катаў, як вялікіх мудрацоў, і асуджэнне іх ахвяр, як вылюдкаў і ворагаў. Самі ж „гома савецікусы" не ліхадзеі. Сярод іх шмат добрых людзей. Аднак для іх характэрны пэўны тып паводзінаў, які ў свой час югаслаў Міхайла Міхайлаў акрэсліў як наіўны і несвядомы езуітызм, апісаны Ф. Дастаеўскім у *Бесах*. „Першае ўражанне, якое выклікае «homo sovie-

[11] О. В о л к о в, *Погружение во тьму*, Москва 2000, s. 97.

ticus» - гэта няспеласць. Наіўная здольнасць верыць нават ва ўласны падман, свядомае заплюшчванне вачэй на ўсё, што гэтай мане пярэчыць, псіхічнае і тэарэтычнае абгрунтаванне найвялікшых подласцей у імя «вышэйшай мэты» - усё гэта стварае вобраз псіхалогіі сярэднястатыстычнага «homo sovieticus»[12].

Сакрат Яновіч уважае, што на сёняшняй Беларусі людзі савецкага тыпу складаюць абсалютную большасць (ён называе лічбу 80%), а сапраўдныя беларусы (свядомыя сваіх каранёў і прыналежнасці да нацыі) – гэта маргінальная з'ява. Паводле Яновіча іх колькасць не перавышае 20% ад агульнага насельніцтва краіны[13].

Да інструментаў, з дапамогай якіх фармаваўся новы чалавек, належалі: страх, нянавісць да ўяўнага (указанага партыяй) ворага, улада над памяццю (гісторыяй) і прыватным жыццём, кіруемае жабрацтва, навамова, літаратура, мастацтва. Аб'ектам атакі становіліся ўсе тыя вузы паміж людзьмі, якія ўтвараюць грамадскую супольнасць: рэлігія, сям'я, гістарычная памяць, мова. Грамадства сістэматычна і планава разбуралася, яго сябры пазбаўляліся выбраных імі сувязей, замест якіх яны павінны былі прыняць іншыя, выбраныя для іх дзяржавай. Творцы „новага чалавека" усведамлялі, што апрацоўка людзей у гэтым духу павінна быць усебаковай і ахопліваць усё насельніцтва. Алег Волкаў са здзіўленнем канстатаваў, што яму прыходзілася, самым нечаканым чынам, чуць ад людзей „інтэлігентных", знаўцаў у сваёй спецыяльнасці, універсітэцкіх выкладчыкаў, амаль што дакладны пераказ прапагандысцкіх доказаў газетных перадавіц. І гэта далёка не заўсёды было перастрахоўкай, асцярожнасцю, а адлюстраваннем доўгагадовага ўдалблівання прызнання справядлівасці ладу і яго асноў. Цалкам адзвычаіўшыся ад крытычнага асэнсавання, яны аўтаматычна паверылі ў паўторанае незлічона. „Дзе знайсці філосафаў, знаўцаў чалавечай псіхалогіі, здольных растлумачыць, якім гэта чынам мільёны людзей, і ведаючы, што яны жывуць бядней, бяспраўней, больш ушчэмлена за сваіх сучаснікаў у большасці іншых краін, працягваюць ставіцца з падазронасцю і недаверам да парадкаў у замежных народаў? Тупа не падвяргаючы сумневу сваю сістэму, якая відавочна збанкрутавала, нібыта завешчаную аж самім Леніным, якога яны па інэрцыі, аднымі губамі працягваюць называць вялікім правадыром?"[14], пытаецца ён, і сам дае адказ. Гэтае ўсенароднае вырачэнне свабоды меркаванняў, ацэнак, права на асабістую думку і прыхільнасць трымаецца на тым смяротным страху, які ўнушылі насель-

[12] M. M i c h a j ł o w, *Tematy rosyjskie*, Paryż: Instytut Literacki, 1967, s. 96.

[13] „Gazeta Wyborcza" z dn. 16.07.2003, s. 2.

[14] В о л к о в, dz. cyt., s. 97-98, 178-179.

ніцтву бальшавікі з першых крокаў свайго праўлення. Тэрор, сістэма запалохвання праз масавыя рэпрэсіі і пакаранні нявінных, скасаванне самаго паняцця правасуддзя прынеслі чакаемыя вынікі. Напалохалі на дзесяцігоддзі, унеслі ў душы сталы жах перад уладай. Менавіта „рыцарычэкісты", гэтыя ўсемагутныя шукальнікі „крамолы", вызначылі на ўвесь наступны час парадак, пры якім ні ў каго ніколі не можа быць свядомасці асабістай бяспекі. Кожны адчувае сябе пад падазрэннем, лёгкай ахвярай нагавора, баіцца мець уласнае меркаванне, быць самастойным, вызначацца чым-небудзь з бязлікай, знівеліраванай масы.

Фундаментам савецкай імперыі быў тэрор і яго неад'емны парастак – страх.

Узнікшы ў 1918 годзе, па ініцыятыве Троцкага і Леніна, інструмент тэрору – канцэнтрацыйны лагер, выконваў не толькі карную, эканамічную, але і псіхалагічную выхаваўчую функцыю. Менавіта ён стаў універсальным сродкам тэрору супраць усіх „няпэўных элементаў" і па ступені суровасці пакарання стаяў адразу пасля смяротнага прысуду. Згаданы ўжо Аляксандр Ват пісаў: „І назва «исправительно-трудовой лагерь» з'яўляецца абсалютна трапнай. Гэта папраўчы лагер, толькі з адной агаворкай. Ідзецца не пра выпраўленне тых пяці ці пятнаццаці мільёнаў вязняў, бо гэта меншасць [...] а справа ва ўсім насельніцтве. У кожнай сям'і хтосьці быў у лагеры і кожны мог чакаць, што туды трапіць. І ў гэтым была ўся справа, каб кожны ведаў, што яму тое пагражае кожную хвіліну, што лагер страшны і што пра гэта нельга казаць, бо гэта святая, сакральная рэч. Каб з дапамогай лагероў выхоўваць усё насельніцтва, якое яшчэ не сядзела ў лагеры"[15]. Аляксандр Салжэніцын піша аб жудасных і неймаверных памерах камуністычнай лагернай імперыі, папраўляючы перабольшаную, на ягоную думку, ацэнку колькасці іх вязняў у 1938 годзе з 20-30 мільёнаў на 12-15 мільёнаў чалавек[16]. Але і тыя 15 мільёнаў – гэта ж амаль што кожны дзесяты жыхар краіны. Такім чынам, была створана лагерная імперыя, якой не ведала гісторыя чалавецтва. Насельніцтва краіны, лік вязняў якой ішоў на мільёны, не магло не адчуваць штодзённага, пастаяннага ўціску, які ламаў псіхіку людзей. Яшчэ ў 1918 годзе Іван Бунін пісаў у сваім дзённіку пра бальшавікоў: „Яны вырашылі перарэзаць усіх пагалоўна, усіх да сямігадовага ўзросту, каб потым аніводная душа не памятала нашага часу"[17]. Пасля вынішчэння былой інтэлігенцыі, сялянства, лепшых людзей усіх саслоўяў утварыўся вакуум. Рэзка зменшылася колькасць або зусім не стала людзей, якія

[15] A. W a t, *Mój wiek*, t. II, Warszawa 1990, s. 106.
[16] Zob. А. С о л ж е н и ц ы н, *Архипелаг ГУЛАГ*, t. I, Москва 1991.
[17] И. Б у н и н, *Окаянные дни*, Санкт-Петербург 2000, s. 115.

б думалі шчыра і незалежна. Да ўлады дарваліся прыстасаванцы і кар’ерысты. Пачынаючы з канца 20-х гадоў паступова нарастаў маштаб, інтэнсіўнасць рэпрэсій і звужаліся жыццёвыя рамкі, у якіх існаваў савецкі чалавек.

Страх, які пачаткова грунтаваўся на падзеле грамадства на групу „партыйцаў”, асоб „маючых пралетарскае паходжанне” і людзей „рэвалюцыйна несвядомых”, аднесеных да „эксплуататарскіх элементаў”, якім толькі часова было даравана жыццё, з’яўляўся магутнейшым сродкам падпарадкавання і інфальтызацыі насельніцтва. Вораг праграмна атрымлівае вызначальную назву капіталіста, памешчыка, буржуя, кулака, контррэвалюцыянера, ворага народа. З гэтай прымітыўнай ідэі выйшла пазнейшая бальшавіцкая практыка ліквідацыі „рэакцыйных класаў”, „эксплуататараў”, масавы камуністычны генацыд, параўнальны толькі з гітлераўскай экстэрмінацыяй горшых народаў, „непаўнацэнных” рас, дарэчы перавышаючы яе колькасцю ахвяр. Адны забівалі яўрэяў, цыганаў, славян за іх нацыянальную прыналежнасць, другія фізічна вынішчалі буржуяў, кулакоў, памешчыкаў за сацыяльнае паходжанне. Пагроза вынішчэння некаторых сацыяльных слаёў, ужо ў самым пачатку існавання бальшавіцкай улады, стварыла атмасферу ўсеахопнага і ўсеагульнага страху, які ўвесь час паглыбляўся і не знік да канца існавання СССР. З часоў Сталіна ўлада была перакананa, што найбольш эфектыўным спосабам змушэння чалавека да дзейнасці згодна з яе намерамі ёсць страх, таму нагнятанне і рэжысіраванне страху стала адметнасцю камуністычнага таталітарызму. У гэтым было закадзіравана перакананне аб пластычнай натуры чалавека і яго падатлівасці на вонкавае ўмяшальніцтва, аб тым, што нішто ў асабістай і калектыўнай актыўнасці не можа быць спантанным актам, без вонкавага імпулсу. Пра трываласць такога пераканання сведчыць наступны факт. Адразу пасля другой сусветнай вайны Анне Ахматавай дазволілі правесці аўтарскі вечар. Шматлікая публіка, пры з’яўленні славутай паэткі ў залі, устала і вітала яе авацыямі. Падчас справаздачы аб гэтым спатканні Сталін запытаўся: „Хто арганізаваў уставанне?”[18]

Псіхоз страху і істэрычнай шпіёнаманіі прыспяшалі атамізацыю грамадства, падпарадкоўваючы яго ва ўсё большай ступені кантролю дзяржавы. У сваім адноўленым, рэанімаваным стане гэты страх існуе і сёння. Паралізуючы страх нарадзіў такія рысы савецкага чалавека, як глыбокае перакананне, што нічога нельга змяніць, што сістэма вечная і наканаваная, што ніякія дзеянні і нават думкі нельга схаваць ад улад. У гэтым сэнсе цікавымі з’яўляюцца назіранні польскага паэта і пісьмен-

[18] Н. М а н д е л ь ш т а м, *Вторая книга*, Париж 1972, s. 145.

ніка, нашага зямляка, ураджэнца Горадні, Віктара Варашыльскага. У другой палове 1950-х ён прыватна сустракаўся ў Маскве з савецкім перакладчыкам польскай паэзіі Маркам Жывавым. Але на сустрэчу той прыйшоў з прадстаўнічкай Саюза пісьменнікаў, якую сам і запрасіў, каб на ўсялякі выпадак мець сведку, што ён не сказаў чужаземцу нічога „няправільнага”. „Зразумела – піша Варашыльскі – што расейцы былі пад значна большым ціскам чым мы. Ніхто з іх не быў „нармальны”, нават тыя антысаветчыкі мелі пэўныя савецкія рэакцыі”. У 1975 годзе, у Польшчы, на сустрэчы наладжанай польскімі сябрамі Яўгену Яўтушэнку, той паклікаў Варашыльскага да кухні і запытаўся, хто з прысутных з'яўляецца „стукачом”. „Калі я яму сказаў, што ніхто – успамінаў Варашыльскі – ён палічыў мяне наіўным. Гэта яму здавалася немагчымым, хтосьці мусіў быць”[19].

Найлепшым асяроддзем для страху з'яўляецца нянавісць. Сталінская эпоха зрабіла са страху абавязковае пачуцце. Нянавісць прышчэпліваў не толькі працэс ідэалагічнага выхавання, але і працэс выхавання ўвогуле, прычым савецкія дзеячы культуры адыгрывалі ў гэтым працэсе неапошнюю ролю. Пагроза з боку „унутраных” і „вонкавых ворагаў” станавілася сапраўднай калектыўнай маніяй, масавай навязлівай ідэяй. Савецкі грамадзянін за мяжой, незалежна ад таго ў якой краіне ён знаходзіўся, сапраўды паўсюль бачыў і асцерагаўся ворагаў. Дарэчы, гэты стэрэатып у значнай ступені захаваўся і ў наш час. Постсавецкія грамадзяне з недаверам ставяцца да Захаду (нягледзячы на тое, што дасканала ўсведамляюць яго цывілізацыйныя і гаспадарчыя перавагі) і ў першую чаргу да краін, у адносінах да якіх камуністычная індактрынацыя савецкіх часоў мела асабліва агрэсіўны характар, напр. ЗША. Існаванне „ворагаў” дапамагала апраўдываць пачынанні ўлад, якія нібыта бараніла краіну і яе грамадзян ад падкопаў і непрыязных акцый, а таксама ўласныя няўдачы, перакладаючы віну на міфічныя інтрыгі непрыяцеляў. Сярод насельніцтва штучна ўзбуджаны страх перад чужынцамі павялічваў пачуццё супольнасці, патрэбу цясней гуртавацца ў калектыў, а дакладней збівацца ў стада. Пры гэтым скарыстоўвалася тое, што людзі наогул лягчэй пагаджаюцца на негатыўную праграму – на нянавісць да ворага, на зайздрасць у адносінах да тых, хто больш заможна жыве, чым на пазітыўную мэту. Супрацьстаўленне „мы” – „яны” заўсёды ўжываецца тымі, хто патрабуе не толькі падтрымкі палітыкі але і лаяльнасці шырокіх мас.

---

[19] W. W o r o s z y l s k i, *Ja w Rosji, Rosja we mnie,* „Gazeta Wyborcza”, z dn. 6-8.04. 1996, s. 8, 11.

Ідэалагічнае выхаванне ў СССР, ці хутчэй, ідэалагічнае ўздзеянне прымае форму масіраванага націску арміі агітатараў і прапагандыстаў. Афіцыйная ідэалогія ствабала нейкі міфічны вобраз савецкага чалавека, і кожная яе новая прыдумка станавілася чымсьці накшталт дырэктывы для ўсіх. Цяжка нават вызначыць сталыя патрабаванні, якія кампартыйныя ідэолагі прад'яўлялі савецкім грамадзянам. Яны мелі зменлівы характар і залежалі ад актуальнай палітыкі партыі, унутранага і міжнароднага становішча, зменаў у ідэалогіі і г.д. Напрыклад, скончыўшы пабудову сваёй дзяржавы і канчаткова здушыўшы ўсялякую апазіцыю, бальшавікі ў 30-я гады XX ст. пачалі шукаць цэментуючую ідэю для абгрунтавання сваіх далейшых дзеянняў. Артадаксальны марксізм, з яго паказальным інтэрнацыяналізмам і абяцаннем будучага знікнення дзяржавы ўжо не падыходзіў, бо рэзка дысанаваў з таталітарным дзяржаўным ладам і імперыялістычнай палітыкай СССР. Таму аб'яднальнай ідэяй становіцца „савецкі патрыятызм", які ўсё болей прыпадабняўся да расейскага. А той сапраўды меў аўтэнтычныя карані і таму даваў уладзе магчымасць лягчэй фарміраваць неабходныя ёй рысы: вернасць камуністычнай дзяржаве і яе лідэрам, самаадданасць і фанатызм, нецярпімасць у дачыненні да „ідэалагічных ворагаў" і іншадумцаў. З расейскай гісторыі выбіралася тое, што было патрэбна на дадзены момант, бліжэйшую перспектыву ці даўгатэрміновы перыяд – герояў і сяброў, якіх трэба любіць і ворагаў, якіх трэба ненавідзець. Прэпараваная такім чынам гісторыя набыла рысы пачварнага гібрыду расейскага нацыяналізму і марксізму. У выніку Іван Жахлівы стаў прагрэсіўным дзеячом, бо ўмацоўваў цэнтралізаваную маскоўскую дзяржаву, а Рэч Паспалітая была рэакцыйнай, бо ў ёй не было моцнай каралеўскай улады (чытай: панавала анархія) і жылі беларусы ды ўкраінцы, на землі якіх прэтэндавала Масква. Паступова і незаўважальна догма артадаксальнага марксізму аб „класавай барацьбе" пачынае звязвацца з догмай рускага нацыяналізму. Для ілюстрацыі гэтай з'явы Міхаіл Гелер і Аляксандр Некрыч у сваёй гісторыі Савецкага Саюза прыводзяць вельмі трапны прыклад разважанняў Освальда Шпэнглера пра працэс псеўдамарфоза (тэрмін узяты з мінералогіі). Вада вымывае са скалы крышталі мінералаў. У выніку геалагічных працэсаў і вывяржэння вулканаў выцякае лава, якая запаўняе пустоты, што ўтварыліся пасля вымывання першапачатковых мінералаў, застывае і крышталізуецца. Такім чынам, паўстаюць фальшывыя формы, унутраная структура якіх супярэчыць іх вонкавай структуры. Узнікае адзін від камня ў выглядзе іншага, тое, што мінеролагі і называюць псеўдамарфозам[20]. Пустоты, вымытыя бальшавіцкай рэвалюцыяй на

[20] M. H e l l e r, A. N i e k r i c z, *Utopia u władzy (Historia Związku Sowieckiego)*, Londyn:

месцы былых каштоўнасцей: патрыятызму, рэлігіі, маралі, нацыянальнай культуры і гісторыі, якраз і запаўняліся камуністамі „савецкім патрыятызмам”, „савецкай маральнасцю”, савецкай культурай і камуністычнай інтэрпрэтацыяй гісторыі. Абылганае і фальсіфікаванае мінулае, як і скажоная сучаснасць, суправаджалі савецкага чалавека ад нараджэння да могілак. Сама гісторыя падпарадкоўвалася дасягненню чыста палітычных мэтаў, а яе новая інтэрпрэтацыя давала ўладзе магутную зброю ў барацьбе з усялякімі праявамі нацыянальнай незалежнасці, у якой бы форме яна не выяўлялася.

Важнае месца ў фарміраванні савецкага чалавека займала камуністычная міфалогія. Яе практычны сэнс для ўлад заключаўся ў тым, што ўплыў міфалогіі на савецкага чалавека дазваляў яму верыць у тое, што не існавала і, адначасова, не заўважаць рэчаіснасці, або мець яе скажоны вобраз. Паколькі міф, па сваёй сутнасці, ёсць з’ява ірацыянальная, яго цяжка абвергнуць пры дапамозе лагічнага меркавання і розуму. Той, хто носіць у сабе міф – не слухае аргументаў, ён проста перакананы, што мае рацыю і не патрабуе доказаў. Таму панаванне над міфамі і права на іх стварэнне было магутнай зброяй камуністычнай партыі. Міфы з’яўляліся звеннямі таго магічнага кола, у якім нараджаўся і паміраў савецкі чалавек. Гэта быў, перш за ўсё, міф утопіі, казкі пра непазбежную перамогу камунізму, своеасаблівая псеўдарэлігія. Тое не значыла, што савецкія людзі верылі ў камунізм. Хутчэй наадварот. Перакананых камуністаў у Савецкім Саюзе было відаць значна менш чым на Захадзе, і ўлады пра гэта дасканала ведалі. Больш за тое, савецкае кіраўніцтва дасканала разумела, што камуністычнае грамадства неажыццявіма. Справа была не ў веры, а ў жаданні падпарадкаваць людзей акрэсленым правілам гульні, прыдуманым і навязаным камуністамі. Мэтай было не давесці, а ўбіць гатовыя формулы ў галовы грамадзян. Верацьяны ў іх ці не, партыю гэта цікавіла няшмат. Але калі яны не жадалі прымаць гэтыя формулы ў якасці пастулатаў – шлі пакаранні, дыяпазон якіх быў вельмі шырокі, ад банальнага звальнення з працы да затачэння ў канцлагер. Ад савецкага грамадзяніна патрабавалася, каб ён безумоўна выконваў акрэслены рытуал. Удзел у „абрадах” быў абавязковым, незалежна ад таго, якое чалавек меў да іх стаўленне. Камуністычную наменклатуру гэта збольшага таксама не цікавіла. Яна і не імкнулася нікога пераконваць. Галоўнымі былі вонкавае падпарадкаванне і маніфестацыя пакорлівасці, дача ўстаноўкі. Цягам дзесяцігоддзяў чалавек прывыкаў да такога стану і лічыў яго натуральным. Бясконцае паўтарэнне адных і тых жа формул і ідэ-

Polonia 1985, s. 245.

алагем, падмацаваных адпаведнымі карнымі санкцыямі, прыводзіла да таго, што савецкія грамадзяне прызвычаіліся казаць так, а не інакш, калі гаворка ішла пра рэчы жыццёва важныя для існавання савецкай наменклатуры. Пераможаны прымаў філасофію пераможцы, і, такім чынам, сапраўды быў пераможаны. У творчасці французскага драматурга Эжэна Іанэска часта сустракаецца тэрмін „рынацэрас”. Рынацэрас – гэта чалавек гатовых ідэй. Менавіта гэта адбываецца, калі людзі ўжо не думаюць, а толькі прымаюць лозунгі прапаганды.

Камуністычная ўлада шырока выкарыстоўвала міфы, але не як сродак пераўладкавання грамадства, як гэта было ў гісторыі раней, а для ўмацавання існуючай структуры ўлады і для прымушэння насельніцтва падпарадкавацца ёй. Неабмежаваныя міфатворчыя магчымасці ў СССР вынікалі з татальнай улады дзяржавы над усімі інструментамі, якія фарміравалі чалавечую свядомасць і неабмежаваных матэрыяльных магчымасцей дзяржаўных структур у гэтай сферы.

Сістэма стварэння міфалогіі ўключала ў сябе вельмі важны элемент. Маецца на ўвазе пастаяннае і прымусовае вывучэнне марксізму-ленінізму вучнямі і студэнтамі. Яна складала частку абавязковай і руціннай работы па ўвядзенні артадаксальнай дактрыны ва ўсе сферы інтэлектуальнага і культурнага жыцця, паколькі толькі ёй быў нададзены статус адзінай легальнай ідэалогіі. На практыцы гэта ўвасаблялася ў бясконцае вывучэнне г. зв. „ідэалагічных” дысцыплін, ад школы да ўніверсітэтаў, у нарастаючым аб’ёме. Марксізм-ленінізм усеахопна прысутнічаў у абавязковым вывучэнні „гістарычнага” і „дыялектычнага” матэрыялізму, „навуковага” камунізму і гісторыі КПСС, „навуковага” атэізму, палітэканоміі капіталізму і сацыялізму, прычым у непрапарцыянальна вялікіх аб’ёмах. Гэтай жа мэце служылі перманентныя абавязковыя палітінфармацыі і партыйныя сходы. Прапагандаванне і прышчапленне мільёнам людзей „дыялектычнага” бачання свету праз крайне спрошчаную чорна-белую схему (мы-яны, сацыялізм-капіталізм), давала псіхічны камфорт, дазваляючы найскладанейшыя праблемы прадстаўляць у такой рэдукаванай постаці, што яны набліжаліся да абавязковай казачнай канвенцыі тыпу зло-дабро, даючы людзям ілюзію разумення. Такім чынам мы маем тут справу з магутнай прыладай, якая дазваляла рэалізатарам таталітарнага ладу кіраваць чалавечай свядомасцю.

У момант канчатковага краху камуністычнай сістэмы адпаў вонкавы ахоўны слой, у выглядзе вобразу ілюзорнага свету і міфаў-хімер. Свет міфаў страціў свой фармальны сэнс існавання, адкрылася жудасная рэчаіснасць ва ўсіх сферах грамадскага і эканамічнага жыцця. Гэта выклікала з аднаго боку шок, а з другога калектыўны псіхоз, які быў

наступствам не толькі пазбаўлення ілюзій, але і адсутнасці здольнасці ці нават жадання пагадзіцца з новаўзніклай рэчаіснасцю. Вацлаў Гавел параўноўвае гэты посткамуністычны стан мыслення з пачуццём няпэўнасці спустошанасці і фрустрацыі, выкліканых цяжкасцямі прызвычайвання да новага тыпу адказнасці ва ўмовах свабоды[21]. Гэта ў значнай меры тлумачыць настальгію па „мінулых часах”, а ў сферы палітыкі – падтрымку рухаў, партый і асоб, якія прадстаўлялі ў мінулым уладу ці імкнуліся яе капіраваць або аднаўляць.

Падзенне імперыі СССР зліквідавала таксама адзіны бадай што рэальны стымул існавання савецкага грамадства – гонар савецкіх людзей з прычыны прыналежнасці да „вялікай дзяржавы”, які замяняў ім жыццё поўнае нягод, нястач і жабрацтва, нагадваючы своеасаблівы працяг былой імперыяльнай гордасці падданых царскай Расеі. У першай палове XIX ст. французскі падарожнік і літаратар Маркіз Астольф дэ Кюсцін пісаў, што душу расейскага народа хвалюе вялізная неспакойная амбіцыя. Народ гэты, пісаў ён, па натуры сваёй захопніцкі, прагны, які, тым не менш, адчувае нястачу літаральна ва ўсім, уніжальную пакорлівасць перад айчыннымі ўладамі авансам выкупляе падпарадкаваннем сваёй тыраніі іншых народаў. Слава і багацце, на якія ён спадзяецца з гэтае нагоды, адцягваюць яго думкі ад перажытай ганьбы рабскай падначаленасці ўласным сатрапам. Таму, каб змыць з сябе пляму ганебнага ахвяравання палітычнай і асабістай свабодай, нявольнік укленчыўшы марыць аб панаванні над светам[22]. Ва ўсіх постэсэсэраўскіх краінах на змену гэтай імперыялістычнай ідэалогіі прыйшлі нацыянальна-дзяржаватворныя ідэі. На Беларусі такой ідэі, у маштабах усяго грамадства, сфармуляваць не ўдалося, таму што ў БССР савецкасць развівалася не побач з нацыянальнай ідэяй, як гэта было, ў той ці іншай ступені, у іншых савецкіх рэспубліках, а замест яе. Менавіта праз катэгорыі савецкай ідэалогіі, і толькі праз іх, бээсэсэраўскі беларус усведамляў сэнс свайго жыцця ў новых умовах савецкай супольнасці, а гэта непазбежна аслабляла патрэбу фарміравання ўнутрынацыянальных сувязей. У выніку беларускае грамадства аказалася пазбаўленым магчымасці вызначэння і фармулявання групавых ідэалаў, і, адпаведна, стварэння механізмаў іх рэалізацыі. Адсюль, згодна з прынцыпам вакууму, такое выразнае імкненне да вяртання стану, які існаваў да распаду СССР. Для большасці беларускіх грамадзян па ранейшаму характэрна мысленне ў катэгорыях прыналежнасці да Савецкага Саюза, уяўнага падтры-

[21] V. H a v e l V, *Postkomunizm*, „Kultura” [Paryż] 1996, nr 1/580-2/581, s. 3-4.

[22] de C u s t i n e, Astolf, *La Rusie en 1839*, t. I-IV, Paris 1846, s. 225; 63-308; 356, 397; 354, 355.

млівання сацыяльнай сувязі з неіснуючай ужо дзяржавай і супольнасцю савецкіх людзей. Паняцце нацыянальных інтарэсаў і інтарэсаў беларускай дзяржавы ўсё яшчэ застаецца далёкім агромістай большасці жыхароў краіны, якія сваімі пачуццямі і эмацыянальна ўсё яшчэ звязаны з былой імперыяй, беспаспяхова шукаючы ў раздзіраемай канфліктамі Расеі чарговага заменніка СССР.

*Homo sovieticus* не мае пачуцця гістарычнага мінулага. Быццам бы свет паўстаў толькі ўчора. У адчуванні большасці былых савецкіх грамадзян усё, што дзеялася да 1917 года, лічыцца не толькі няважным, але таксама і малацікавым[23]. Што ім за справа да Сярэднявечча ці Рэчы Паспалітай, а тым больш да Месапатаміі, Егіпту ці старажытных філосафаў. Таму калектыўная гістарычная памяць рэдка пераходзіць межы перыяду існавання на Беларусі савецкай сістэмы, а калі гэта і здараецца, дык тычыцца пераважна эпізодаў ці асоб гісторыі расейскай (чамусьці найчасцей такой постаццю з'яўляецца Пётр І). Аднак чацей за ўсё гісторыя ўспрымаецца сучасным сярэднестатыстычным беларусам як тое, што чалавек пеpажыў сам, а ўласнае жыццё вызначае межы яе ўспрымання. Пры такой сітуацыі існаванне нацыянальных ідэалаў, адрозных ад савецкіх, проста немагчымае. Як слушна адзначае польскі даследчык беларускага грамадства Рышард Радзік: „Ідэалогія не санкцыянавала прыватнага часу для развіцця асобы. Жылі сёняшнім днём, тут і зараз. Гэта адрознівала і цяпер адрознівае беларусаў ад палякаў, чэхаў, венграў, час якіх насычаны катэгорыямі нацыянальнага мыслення, якому спадарожнічае моцная гістарычная свядомасць, актыўнасць элітаў, якія жывуць паводле традыцый. У значнай ступені гэтак было і ў Расеі, але толькі на ўзроўні эліты, а не народа. У Беларусі час новай ідэалогіі не напаткаў такіх перашкодаў”[24].

Міфалагічнае мысленне мае вельмі трывалы характар, таму яно амаль без змен і страт перакачавала ў постсавецкае жыццё. На Беларусі гэта бачна як бадай што нідзе больш. Усе гэтыя Леніны, Калініны і Дзяржынскія на пастаментах пасярод гарадоў і ў назвах вуліц, „акцябарскія праздзнікі” і іншыя савецкія святы, гадавіны, юбілеі, разам з савецкім стылем мыслення, „ленінскімі суботнікамі”, „дошкамі пашаны” і савецкай сімволікай – гэта адтуль, родам з савецкага камуністычнага міфа. Ён мае і яшчэ адно вымярэнне, бо з яго дапамогай разбэшчваліся аўтэнтычныя нацыянальныя і патрыятычныя пачуцці. Кампартыя прыкладала ўсе

[23] Адзін з высокапастаўленых чыноўнікаў беларускага МЗС заяўляў у сярэдзіне 90-х гадоў, што ён абыякавы да гербу „Пагоня”, таму што нарадзіўся ў БССР, а не ў Вялікім Княстве Літоўскім.

[24] Р. Радзік, *Беларусы (Погляд з Польшчы)*, Мінск 2002, s. 103-104.

намаганні, каб у свядомасці людзей паняцце расейскасці стала ў адзін шэраг з паняццем савецкасці, а антысавецкасць з антырасейскасцю. У працэсе ўзаемапаглынання паняццяў наступіла змена нацыянальных пачуццяў і расейскі нацыяналізм перарадзіўся ў элемент савецкай ідэалогіі. Нацыянальныя пачуцці нерасейскіх народаў былі важнейшым бастыёнам супраціву савецкім міфам, таму КПСС люта змагалася з нацыяналізмам народаў СССР. Заўважым, што ніхто ў Савецкім Саюзе не быў асуджаны за расейскі нацыяналізм. Крамлёўскія ўлады змагаліся не супраць расейскага шавінізму, а супраць асноўнай перашкоды камунізацыі і дэнацыяналізацыі – супраць інтэлектуальна-духоўнай эліты ўсіх народаў. Прыкладаў фізічнага генацыду ў гісторыі шмат, але духоўны генацыд упершыню пачаў практыкаваць толькі савецкі імперыялізм. Гэты этнічны генацыд Масква пачала з мовы. Калі ёсць што-небудзь адвечнае, запаветнае і лёсавызначальнае, дамінанта ўсіх пачуццяў і ідэй у якім-небудзь маленькім ці вялікім народзе – дык гэта яго нацыянальная самасвядомасць, самасвядомасць сваёй непаўторнасці, унікальнасці. Але ўзнікае адчуванне асуджанасці, калі народ пазбаўляецца асноўнай прыкметы сваёй унікальнасці – нацыянальнай мовы. Адсюль вынікала, што ў любой імперскай шматнацыянальнай дзяржаве ўрад у нацыянальным пытанні праводзіў палітыку моўнай дэнацыяналізацыі скораных нацый і навязвання ім мовы пануючай нацыі. Аднак савецкі тып імперыялізму вылучаўся навізной – ён не толькі праводзіў моўную дэнацыяналізацыю, але і дэнацыяналізацыю гістарычную, сістэматычна выкрэсліваючы з памяці народаў іх гістарычнае мінулае. Савецкі шлях нацыянальнага развіцця прадугледжваў перамолванне народаў з мэтай стварэння нейкай міфічнай агульнай камуністычнай нацыі з адной агульнай мовай. Гэтая стратэгія прадугледжвала, поруч з увядзеннем прынцыпу абсалютысцкага цэнтралізму, які ператвараў саюзныя рэспублікі ў чыста геаграфічныя паняцці, правядзенне ў іх такой нацыянальнай палітыкі, якая спрыяла максімальнай нацыянальнай нівеліроўцы. Дзеля гэтага быў узяты курс на перавод усіх партыйных, дзяржаўных, гаспадарчых, навуковых устаноў і школ на рускую мову, абмяжоўваючы прымяненне мясцовых моваў толькі сферай прапаганды, мастацкай літаратуры і мастацтва. Гэтая палітыка як дзве кроплі вады падобная на тую, што праводзіцца на Беларусі сёння, у фармальна незалежнай краіне пачатку XXI стагоддзя. Адноўленая дактрына вялікадзяржаўнікаў і абмаскаленых мясцовых кіраўнікоў[25] – „двухмоўе” – гэта толькі новы назоў той жа самай русіфікацыі.

[25] Гэта выглядае парадаксальна, але тым не менш з’яўляецца фактам. Калі ў часы існавання СССР на чале нацыянальных акраін станавіўся абруселы „нацыянал”, дык ён

Расейска-кэгэбісцкая мадэль дэнацыяналізацыі, якая існавала ў СССР, прадугледжвала, між іншым, стварэнне такога становішча, у якім ўсе праявы беларускасці зводзіліся б да праяваў фальклорнай адметнасці і рэгіянальных асаблівасцей. Сёння, з перспектывы некалькіх дзесяцігоддзяў гэтай хітрай палітыкі, можна сказаць, што яна шмат у чым дасягнула поспеху. Прынамсі сёняшняя беларуская наменклатура, якая ўжо сама валадарыць ва ўласнай дзяржаве, успрымае беларускасць у катэгорыях фальклорнай экзотыкі. Спробы ж наладжвання аўтэнтычна беларускага грамадскага і палітычнага жыцця ўспрымаюца ёю як праява скрайняга нацыяналізму. Беларуская мова можа гучаць са сцэны ў выглядзе народных спеваў і прыпевак, але ў рэальным жыцці яна ўспрымаецца як нешта анамальнае, парушэнне агульнапрынятых нормаў сужыцця. Яе рэальны носьбіт адразу вылучаецца ў групу падазроных дзівакоў або „нацыяналістаў”, у залежнасці ад канкрэтнай сітуацыі і абставін, атрымлівае своеасаблівую метку, паводле якой ён выключаецца з асноўнай групы насельніцтва і можа беспраблемна існаваць толькі ў коле аднадумцаў. Дасягненне такога ненатуральнага становішча і ў такім масавым маштабе (можна сказаць у маштабах усёй краіны) ёсць несумненным поспехам саветызму.

Ці гэтую сітуацыю можна было выправіць? Безумоўна. Валодаючы такім інструментам як незалежная і суверэнная дзяржава, вяртанне да аўтэнтычнага нацыянальнага жыцця магло б стаць толькі справай часу, калі б на тое была адпаведная палітычная воля. Прыкладам можа служыць сёняшняя Ўкраіна, якая ў савецкія часы была русіфікавана няшмат менш чым Беларусь. Але нават і ў савецкія часы не было непераадольных перашкод для захавання свайго нацыянальнага аблічча, пры наяўнасці адпаведнай волі грамадства. Амаль ва ўсіх саюзных рэспубліках універсітэцкая адукацыя адбывалася на нацыянальных мовах, што значна павышала іх прэстыжнасць. Калі пасля ўвядзення „брэжнеўскай” канстытуцыі СССР 1977 года, у канстытуцыю Грузіі паспрабавалі ўвесці новы артыкул, які ўраўноўваў правы рускай і грузінскай моў у якасці дзяржаўных, у Тбілісі пачаліся масавыя пратэсты, якія прымусілі ўлады адступіцца ад гэтага намеру. Грузінская мова захавала сваё вядучае становішча. Некаторыя нацыянальна-арыентаваныя першыя сакратары ЦК кампартый саюзных рэспублік, выкарыстоўвалі гэтую пасаду дзеля ўмацавання культурнага, моўнага і эканамічнага развіцця сваіх рэспуб-

---

праводзіў адкрыта вялікадзяржаўную палітыку супраць сваёй нацыі. Такі ж навык застаўся ў гэтага тыпу людзей і сёння, толькі цяпер можна казаць хутчэй пра антынацыянальную палітыку айчынных ўрадоўцаў і чыноўнікаў, якія, ў выніку глыбокай і інтэгральнай русіфікацыі савецкага часу, не ўяўляюць сябе ў іншым моўна-культурным асяроддзі чым расейскае.

лік, напрыклад: Пётр Шэлест на Ўкраіне, Ахундаў у Азербайджане, Мжаванадзэ ў Грузіі, І. Кэбін у Эстоніі, А. Снечкус у Літве і г.д. На жаль, нават такога тыпу кіраўнікоў на Беларусі не было. Усхваляемы астатнім часам крыптабальшавікамі Пётр Машэраў хутчэй прычыніўся да канчатковай русіфікацыі Беларусі ў 70-я гады мінулага стагоддзя.

Важнае для Масквы геастратэгічнае становішча Беларусі прывяло да таго, што і царызм, і бальшавікі праводзілі тут метадычную, жорсткую і ўпартую палітыку русіфікацыі. Маскве трэба было, каб Беларусь насяляла рускамоўнае насельніцтва, нават не рускі народ, а рускамоўнае насельніцтва. Бо трэба ўлічваць, што стратэгія стварэння „савецкага народа" неабавязкова павінна была азначаць жорсткую этнічную русіфікацыю. На першы план тут заўсёды высувалася логіка таталітарызму, у якой галоўнай была дэнацыяналізацыя, разбурэнне ўнутранай згуртаванасці нацыянальных груп, нейтралізацыя духоўнай тоеснасці. У камуністычных краінах гэтая палітыка заўсёды рэалізоўвалася пад лозунгам „культурнай рэвалюцыі", г. зн. унясення новага зместу ў старыя формы. Аўтэнтычная ж расейская культура магла пагражаць дасягненню гэтых мэтаў, таму русіфікацыя праводзілася ў форме „саветызацыі", растварэння ўсіх адметнасцей у агульным катле. З гэтай мэтай скарыстоўвалася злёгку мадыфікаваная ленінская формула „узаемнага збліжэння народаў".

У свой час савецкая псіхіятрыя афіцыйна прызнавала, што „апазіцыйнае мысленне" – гэта псіхічная хвароба. Савецкае грамадства лічылася здаровым, а калі хто-небудзь выказваў сумнеў што да яго ідэальнага характару, дык такі чалавек здаровым быць не мог. З пункту гледжання спецыялістаў-псіхіятараў савецкай школы такі погляд быў лагічны, бо зыходзячы з такога меркавання, людзі, якія думаюць інакш, гэта сацыяльныя адкіды, маргіналы, матэрыял які не паддаўся апрацоўцы і захаваў уласнае аблічча. Карацей кажучы, гэта тыя, хто нязмог палюбіць рабства. Іншы бок аксіяматыкі такога мыслення добра праілюстраваў Міхаіл Васленскі, які сам калісьці належаў да савецкай акадэмічнай наменклатуры. Апісваючы тып супрацоўнікаў савецкіх „органаў", ён сцвярджае, што дысідэнтаў яны зусім шчыра лічылі альбо жулікамі, альбо псіхічна ненармальнымі, будучы ўпэўненымі, што ніякіх перакананняў, апрача імкнення лепш уладкавацца ў жыцці, у людзей няма і быць ня можа[26]. Асновы такога стаўлення закладаліся з самага пачатку існавання савецкай дзяржавы і не апошнюю ролю ў іх пабудове адыгралі прадстаўнікі культуры, якая разглядалася як „авангард ідэалагічнага фронту". У 1930 годзе Максім Горкі здзекліва пісаў, што ўсё

---

[26] М. В о с л е н с к и й, *Номенклатура. Господствующий класс Советского Союза*, Москва 1991, s. 399.

ж карысна чытаць „буржуазную прэсу”, бо: „Хваробы не павінны, ды й нямогуць цікавіць здаровага чалавека, але медык павінен вывучаць іх. [...] Нашы журналісты пастаўлены выгадней за буржуазных” – пісаў пралетарскі пісьменнік – „нашым добра вядомыя агульныя прычыны сацыяльна-паталагічных з’яў. Таму савецкі журналіст павінен ставіцца да паказанняў буржуазнай прэсы, таксама ўважліва, як урач адносіцца да енкаў і стогнаў хворага”[27].

Найбольш вытанчанай, па сваёй жорсткасці, і цынічнай санкцыяй супраць іншадумцаў было заключэнне іх у псіхіятрычны шпіталь. Адзіную цяжкасць уяўляў дыягназ. Але савецкія псіхіятары „з гонарам” выйшлі з гэтай складанай сітуацыі і ставілі дыягназ „млявацякучая шызафрэнія”, якая характаразавалася „паклёпніцтвам на грамадства”, „дрэннай сацыяльнай адаптацыяй”, „хваравітым рэфарматарскім трызненнем”, „паранаідальнай рэфарматарскай маніяй”. Ненармальнымі прызнаваліся, напрыклад, асобы, якія „дэзарганізавалі работу ўстаноў шматлікімі допісамі пазбаўленымі сэнсу”, „упарта баранілі вар’яцкія ідэі пошукаў праўды (дыягназ: „бред правдоискательства”)” ці займаліся не менш паталагічнай справай – „барацьбой за справядлівасць”. Пад такія дыягназы мог трапіць практычна кожны, хто выказваў больш менш самастойную думку, адрозную ад „агульнапрынятай”. Карная псіхіятрыя грунтавалася таксама на звычайнай побытавай перакананасці людзей, якім дысідэнт насамрэч мог здавацца вар’ятам, калі ён выступаў супраць магутнай дзяржавы, без шанцаў на поспех і без імкнення да канкрэтнай асабістай карысці. Здарыўся парадокс. У ненармальным, дакладней, пабудаваным не ненатуральных прынцыпах грамадстве, нармальныя людзі прызнаваліся псіхічна хворымі. Іх паводзіны, якія ў іншых краінах не выклікалі б ніякага непаразумення, у СССР разглядаліся як анамальныя.

Тут варта прывесці разважанні Эрыха Фрома ў сувязі з суадносінамі паміж г.зв. нармальнасцю і крытэрыямі чалавечай каштоўнасці. Большасць – пісаў Фром – лічыць структуру свайго ўласнага грамадства такой відавочнай рэччу, што асоба ненадта добра да яе прыстасаваная часам акрэсліваецца імі як менш вартасная. Але ж – гаворыць ён – сапраўды добра прыстасаванай асобай можна лічыць тую, якая добра прыстасавана паводле крытэрыяў чалавечай каштоўнасці. А разумеючы дваіста паняцці „нармальны” і „неўратычны” (паняцце, якое Фром уводзіць для азначэння адхілення ад агульнапрынятай нормы) мы прыходзім да высновы, што асоба, якая з’яўляецца нармальнай у сэнсе добрага прыстасавання, часта з’яўляецца менш здаровай чым неўротык паводле крытэрыяў чалавечых каштоўнасцей. Часта яна бывае больш прыстасаванай толькі

[27] М. Г о р ь к и й, *Статьи и памфлеты*, Ленинград 1948, s. 166.

за кошт саступак у бок адмаўлення ад свайго „я”, зробленых дзеля таго, каб стаць у большай ці меншай ступені кімсьці адпавядаючым таму, чаго – на яе думку – ад яе чакаюць. Уся сапраўдная індывідуальнасць і спантаннасць можа тады быць згублена. З другога боку неўротыка можна ахарактарызаваць як кагосьці, хто не гатовы цалкам здавацца ў барацьбе за ўласнае „я”. Атрымліваецца, што з пункту гледжання чалавечых каштоўнасцей, неўротык менш дэфектыўны чым тая нармальная асоба, якая дарэшты згубіла ўласную індывідуальнасць[28].

Бальшавікі лічылі пашырэнне пісьменнасці перадусім сродкам выхавання народа, таму што, на іх думку, непісьменны чалавек стаіць па-за палітыкай, а гэта значыць і па-за вялікай сферай магчымасцей уздзеяння на яго. Як вобразна і цынічна выказваўся М. Горкі, мэтай „рабоча-сялянскай” дзяржавы з’яўляецца прывядзенне „усёй масы патэнцыяльнай і пасіўнай нервова-мазгавой энэргіі ў актыўны стан...”[29] Менавіта таму савецкі чалавек павінен навучыцца чытаць і пісаць. Адзін з першых дэкрэтаў савецкай улады ўводзіў крымінальную адказнасць за ўхіленне ад павіннасці навучання грамаце[30]. З таго часу як у краіне адбылася ліквідацыя непісьменнасці, насельніцтва канчаткова навучылася чытаць газеты і пісаць заявы. Пагалоўная пісьменнасць, канешне, дазволіла сур’ёзна эканоміць прапагандзісцкія намаганні ўлады, але істотным чынам саступала ўзроўню адукацыі, якую давалі навучальныя ўстановы царскай Расіі. Засвоіўшы перадавіцы, людзі раптам адучыліся размаўляць па людзку, ужываючы штучныя моўныя штампы і скарачэнні. Культура пачынаецца з чалавека, а таму галоўная ўвага ўдзелялася разбурэнню чалавека як асобы. Паколькі культурнае развіццё дзяцей і падлеткаў залежыць ад іх выхавання і адукацыі, дык тут вырашальнае значэнне мела школа.

У першыя гады пасля кастрычніцкага перавароту рэвалюцыйная школа служыла перш за ўсё перакрэсліванню мінуўшчыны і ліквідацыі дарэвалюцыйных духоўных і сацыяльных сувязей. Па меры ўзмацнення савецкай сістэмы, са сталінскіх часоў, аблічча і функцыі школы паступова змяняліся. Савецкая школы пачала выхоўваць вучняў у духу г. зв. камуністычнай маралі. У гэтым сэнсе задачы савецкай адукацыі ўжо не мяняліся да самага канца існавання Савецкага Саюза. Прыкладам,

---

[28] E. F r o m m, *Escape from freedom*, New York 1966, s. 160-161.

[29] Г о р ь к и й, dz. cyt., s. 280.

[30] Дэкрэт СНК аб ліквідацыі непісьменнасці сярод насельніцтва РСФСР ад 29 снежня 1919 г., [w:] *Народное образование СССР. Сборник документов 1917-1973*, Москва 1974, s. 377.

у 50-я гады прадмет гісторыі разглядаўся як курс, які мае вялікае выхаваўчае значэнне дзеля таго, што ён спрыяе разуменню вучнямі марксісцка-ленінскай канцэпцыі развіцця гісторыі. І ў 1977 г. зноў гаворка ідзе пра асаблівае значэнне цыклу грамадска-гістарычных і гуманітарных навук для школьнага выхавання[31]. У праекце ЦК КПСС 1984 года аб напрамках школьнай рэформы гаварылася, што выхаванне савецкага чалавека не павінна ісці ў кірунку толькі перадачы яму акрэсленай сумы інфармацыі, а перш за ўсё павінна выконваць функцыю пераўтварэння асобы ў грамадзяніна сацыялістычнай супольнасці, актыўнага будаўніка камунізму[32]. Цягам адносна нядоўгай савецкай гісторыі савецкая школа ператварылася ў найбольш рэакцыйную і кансерватыўную на свеце. Камуністычная партыя ані на хвіліну не выпускала яе з поля свайго зроку. Гісторыю савецкай школы можна разглядаць як серыю спроб і этапаў пошукаў сумяшчэння выхавання з адукацыяй, а таксама як гісторыю распрацоўкі тэхнічных метадаў, якія дазвалялі пераўтварыць навучанне ў сродак выхавання і насычэння школьных прадметаў „ідэйнасцю”. Пры гэтым прывіванне навыкаў самастойнага аналітычнага мыслення, пытанні і сумненні зводзіліся да мінімуму, бо супярэчылі ўсёй сістэме выхавання і адукацыі ў СССР. Была і яшчэ адна адметнасць – падручнікі. Не спыняючыся падрабязна на гэтай вузкай і спецыяльнай тэматыцы, адзначым толькі агульны характар тагачасных беларускіх падручнікаў па гісторыі, якія адзначаліся падпарадкаванасцю заключанай у іх інфармацыі інтарэсам Расеі і СССР. Можна сказаць, што камуністы арганізавалі школьніцтва такім чынам, каб ніхто не выйшаў за рамкі афіцыйна дазволеных ведаў і адукацыі (маюцца на ўвазе канешне гуманітарныя навукі), а „пралетарская” дзяржава не аказалася з наяўнасцю грамадзян, якія б валодалі „празмернымі” ведамі і, тым самым, ператварыліся ў „падрыўны элемент”. Пры гэтым савецкая мова, ці як яе яшчэ называюць – новамова, стала галоўным бар’ерам, які ахоўваў выхад па-за неабходны дзяржаве абсяг ведаў. Гэтая мова мела тую адметнасць, што словы ў ёй страцілі свой іманентны сэнс і ўлада ўкладала ў іх патрэбны ёй змест.

Яшчэ на пачатку 20-х гадоў бельгійскі прафесар філолаг Шарль Саралеа, перад паездкай у савецкую Расею, наведаў чэхаславацкага прэзідэнта Масарыка, аднаго з найлепшых знаўцаў Расеі і бальшавізму свайго часу. Той параіў яму перадусім даследаваць пытанні, звязаныя з савецкім школьніцтвам. Ён дасканала разумеў, адзначае Саралеа, што ў савецкіх школах я знайду найбольш красамоўны паказчык бальшавіцкіх

[31] *Советская школа на современном этапе*, Москва 1977, s. 19-21.

[32] Zob. „Правда” 1984, z dn. 29.04. 1984.

палітычных мэтаў, а таксама найбольш пераканаўчы крытэрый і мерку іх поспеху ці банкруцтва. У савецкай Расеі адукацыя мусіць служыць перш за ўсё палітычным мэтам, пісаў прафесар. З бальшавіцкага пункту гледжання, адукацыя і муштраванне дзяцей з'яўляецца можа найвялікшай і найтрывальшай справай савецкіх улад. Выхвалянні савецкіх дыктатараў могуць стацца праўдай. Можа аказацца, што ў рэшце рэшт ім ўдалося стварыць новы тып грамадства. Але калі б ім у гэтым сапраўды пашанцавала, няхай жа Боская воля ўратуе Расею і Еўропу ад гэтага будучага пакалення, робіць выснову Саралеа[33].

Асаблівы наступ быў скіраваны на сямейныя вузы, паколькі сям'я магла стаць важным прытулкам духоўнай незалежнасці. Таму яе трэба было скампрамітаваць, выкарыстоўваючы пры гэтым натуральныя канфлікты пакаленняў і ўзнімаючы іх да рангу канфліктаў палітычных. Кроўную роднасць, эмацыянальнае стаўленне да бацькоў трэба было прадставіць як буржуазны перажытак. У выніку, пазітыўныя героі прапаганды ўзбагаціліся постацямі даносчыкаў. Хрэстаматыйным стаўся ўжо прыклад Паўліка Марозава, які данёс на свайго бацьку, выступаючы супраць яго ў судзе ў якасці сведкі абвінавачвання. Менш вядомы прыклад трынаццацігадовай Проні Калыбінай, якая данесла на матку. Пра гэта пісала газета „Праўда" у 1934 годзе, усхваляючы гэты паступак. Каб накарміць сваіх галадаючых дзяцей, жанчына „скрала" трохі калхознага збожжа і на падставе дэкрэта „аб каласках" была прысуджана да дзесяці гадоў лагераў. Сямнаццаці гадоў хапіла, каб перарабіць чалавечую асобу і давесці яе псіхіку да зусім ненатуральнага стану. Мы не можам дакладна сказаць, наколькі гэтыя выпадкі былі частымі, але ўжо сам факт, што яны скарыстоўваліся савецкай прапагандай у якасці прыкладу, сведчыць аб узорах тагачасных „ідэалаў" і кірунках „перакоўкі" асобы. Сёння мы не назіраем такіх крайніх праяў, але ўсеагульная звычка данасіць, узгадаваная пры савецкім ладзе, засталася нязменнай.

На заранку савецкай улады аўтарытэтам у галіне выхавання стаў Антон Макаранка, педагог, які меў за сабой вопыт працы ў папраўчых калоніях ГПУ і НКВД, а яго тэорыя на нейкі час стала дзяржаўнай тэорыяй выхавання. Сутнасць яе заключалася ў тым, каб прапанаваны ім метад выхавання злачынцаў-падлеткаў зрабіць універсальным метадам савецкай педагогікі. Дзіця трэба выхоўваць у калектыве, вучыў Макаранка, прычым у калектыве мілітарызаваным, у пашане да аўтарытэту калектыву і правадыра. Сям'я гэта таксама калектыў, лічыў ён, і найважнейшае ў ёй менавіта інтарэсы калектыву, якія выказвае той, хто яе аўтарытарна прадстаўляе. Такім чынам, стваралася адзіная сістэма

[33] Zob. C. S a r o l e a, *Ce que j'ai vu en Russie sovietique,* Paris 1925.

выхавання, у якой дзіця выхоўвалася ў аўтарытарнай сям'і, затым у таталітарнай школе і дзяржаве. Гэтак пачалі выхоўваць пакаленні нявольнікаў, для якіх дзяржава стала найвышэйшым калектывам і аўтарытэтам.

У 1924 г. згаданы ўжо прафесар Шарль Саралеа пачуў у Маскве ад аднаго высокага савецкага чыноўніка выказванне наступнага зместу: трэба знішчаць, перш чым пачынаць будаваць. Нават калі б вы змаглі даказаць, што мы не можам прывесці на сваю карысць аніводнай пазітыўнай справы, не трэба забывацца, што мы зрабілі асноўную рэч, значна больш важную чым усё наша знішчэнне – мы стварылі новы чалавечы матэрыял. Калі мы адыдзем, наша справа не памрэ разам з намі. У гэтай бальшавіцкай пахвальбе, піша Саралеа, месціцца жорсткая праўда. Сапраўды бальшавікі пасеялі зерне будучых катастроф. Ім ўдалося атруціць розумы цэлага пакалення. Справа ажыццёўленая бальшавіцкімі ўладамі, ёсць сапраўднай справай шатана, а яе наступствы могуць цалкам выявіцца толькі ў будучыні[34].

Цягам сямідзесяці чатырох гадоў „будаўніцтва сацыялізму і камунізму” удалося стварыць масы людзей, пазбаўленых усялякай зацікаўленасці працай, перакананых, што тыя, хто іх стварыў абавязаны заспакойваць іх патрэбы, людзей прыстасаваных да жыцця ў асаблівых умовах, што існавалі ў Савецкім Саюзе. Сацыяльны капітал, які мы вынеслі з таго грамадства не ўражвае і характаразуецца вялікай ступеньню ўзаемнага недаверу. Прыгледзімся бліжэй да гэтага чалавечага тыпу. У жыцці асабліва важным з'яўляецца давер да людзей. Давер, ці перакананне, што людзі звычайна бываюць зычлівыя і дабрасумленныя, наогул можна разлічваць на іх дапамогу ў цяжкіх сітуацыях. Прынамсі яны не чакаюць магчымасці каб абцяжарыць каму-небудзь жыццё, скарыстаць ягоную слабасць, дапякчы, зрабіць шкоду, знішчыць. Недавер жа выяўляецца ў перакананні, што ўсе людзі эгаісты, несумленныя, цынічныя, і толькі дурні маюць давер да іншых і робяць для іх нешта добрае. Грамадзянскую супольнасць можна будаваць толькі на псіхалагічным фундаменце сацыяльнага даверу. Людзі, якія недаўяраюць іншым, лічаць таксама, што нявартa займацца грамадскай працай, арганізоўвацца, каб вырашыць агульныя праблемы альбо падтрымліваць слабейшых. Але яны няздольныя таксама развіваць і ўласныя здольнасці, ініцыятывы. Ніхто не будзе рызыкаваць шукаць новыя рашэнні, калі ён перакананы, што ягоныя промахі нехта супраць яго выкарыстае. Адсутнасць даверу прыводзіць да таго, што людзі становяцца кансерватыўнымі, празмерна асцярожнымі і недастаткова творчымі. Яны

[34] Tamże.

пастаянна наракаюць і становяцца злоснымі, не цешыць іх праца, страчваецца радасць і задавальненне ад жыцця. У 1947 годзе амерыканскі дыпламат, саветнік амбасады ЗША ў Маскве Джордж Кэнан пісаў, што савецкая магутнасць хавала за сваім фасадам бясформенныя людскія масы, сярод якіх не прызнаюцца ніякія незалежныя арганізацыйныя структуры, а тагачаснае пакаленне савецкіх людзей ніколі не спазнала спантаннасці калектыўнай дзейнасці. Калі здарыцца нешта, што парушыць згуртаванасць і спраўнасць партыі як палітычнага інструмента, СССР пераўтварыцца ў адначассе з аднаго з наймацнейшых у адно з найслабейшых і найбольш вартых жалю, бездапаможных грамадстваў, прадракаў Кэнан[35].

Істотай камунізму, поруч з уладай камуністычнай партыі, савецкім уціскам і ўсюдыіснасцю бяспекі, былі: рабская ментальнасць, нясхільная рызыкаваць дзеля здабыцця свабоды, выхада па-за зачараванае кола ілюзій; уяўленне, што існуе такі кіраўнік, такі дыктатар, такі прарок, які чароўным чынам зробіць, што з дадзенага моманту стане добра. Горш за ўсё, што гэтая „рабская ментальнасць”, гэтая туга па „добрым правадыры” надалей абцяжарвае сёняшняе беларускае грамадства і збівае яго з правільнага шляху на кожным завароце. Шмат людзей сумуе па мінулым. Чаму так адбываецца? Трэба ўлічваць, што настальгія па мінуласці падобная да настальгіі, з якой чалавек успамінае дзяцінства, якое зусім не абавязкова было шчаслівае. Таму тут вялікую ролю адыгрывае ідэалізацыя былога. Перадусім сацыяльнага фактару. З аднаго боку была дзяржава рэпрэсій, уціску і падняволення. Аднак з другога, у гэтым падняволенні змяшчаўся элемент апекі. Мур, які трымаў у заключэнні, ахоўваў ад зла капіталістычнага сацыяльнага парадку. У СССР не было беспрацоўных і бяздомных. (Усе павінны былі працаваць, хаця б нават за мінімальную зарплату, у адваротным выпадку пагражала пакаранне за „дармаедства”). Дзяржава запэўнівала сацыяльную і медыцынскую апеку, кватэру, пасля доўгага перыяду чакання можна было купіць машыну, атрымаць тэлефон. Усё было на вельмі сціплым узроўні, але затое гарантаванае. А вось адсутнасць палітычных і грамадзянскіх свабод не ўспрымалася агулам як недахоп сістэмы, паколькі абсалютная большасць нічога пра іх не ведала, а таму і не адчувала ў іх патрэбы. Гэта для чалавека, які на першае месца ставіў такія няўлоўныя рэчы як свабода і годнасць, той лад быў страшны. Большасць людзей, аднак, аддае перавагу таму, што ўлоўнае, канкрэтнае, матэрыяльнае. Да таго ж, асноўная маса фармавалася пад абсалютным уплывам утапічнай індактрынацыі, і гэта адбілася на яе калектыўнай псіхіцы.

---

[35] Zob. G. F. Kennan, *The Sources of Soviet Conduct*, „Foreign Affairs”, 1947 July.

*HOMO SOVIETICUS* - FENOMEN I ARCHETYP

S t r e s z c z e n i e

W artykule podjęto próbę zbadania przyczyn, przebiegu i społecznego kontekstu formowania się nowego typu osobowości, tzn. człowieka sowieckiego, określając jego cechy podstawowe, warunkujące odpowiednie zachowania. Przeanalizowano również metody, sposoby i środki oddziaływania ustroju totalitarnego na jednostkę, w tym też skutki długotrwałej i kompleksowej indoktrynacji ideologicznej.

**Słowa kluczowe**: system totalitarny, komunizm, ideologia, sowietyzacja, represje.

**Ключевые слова**: тоталитарная система, коммунизм, идеология, советизация, репрессии.

**Key words**: totalitarian system, communism, ideology, Sovietization, represje repressions.